1 снежня на вуліцах розных гарадоў свету можна ўбачыць шмат людзей з чырвонымі стужачкамі. Аказваецца, чырвоная стужка – міжнародны сімвал барацьбы са СНІДам. Прапанаваў гэты сімвал амерыканскі мастак Франк Мур. Простая рэч – пяцелька з адрэзка стужкі чырвонага колеру даўжынёй 15 см. Яе носяць ва ўсім свеце, прышпільваючы да адзення, дэманструючы свой клопат і трывогу пра тых, хто ВІЧ-інфікаваны, падтрымліваючы іх надзею, што калі-небудзь шэсце гэтай страшнай хваробы будзе спынена. Чым больш людзей прымацуе чырвоную стужачку, тым лепш будзе чуваць голас тых, хто патрабуе ўвагі да праблемы СНІДу.

І таму ў межах Дня барацьбы са СНІДам студэнты гісторыка-філалагічнага факультэта прынялі ўдзел у флэшмобе. Акрамя флэшмобу, дэкан факультэта Буракоў В. М. правёў гутарку, прымеркаваную да Дня барацьбы са СНІДам. Сёння няма лекаў ад гэтай хваробы. Адзінае, чым мы можам зберагчы сябе ад яе, – гэта нашы веды пра яе.

СНІД – гэта найвышэйшая мера пакарання за неўсвядомленыя паводзіны. СНІД – гэта вораг. Але нельга проста здавацца ў палон ворагу. Мы павінны змагацца. Змагацца за светлую сучаснасць і, вядома, за будучыню.

Любіце жыццё! Памятайце, што адзін няправільны крок можа каштаваць і вашага жыцця, і жыцця сотняў іншых людзей.

**Паліна МІХАСЬКОВА,**
**студэнтка 2 курса гісторыка-філалагічнага факультэта.**

# ЦІКАВЫЯ ЛЮДЗІ СЯРОД НАС

***Літаратурная вечарына “Цікавыя людзі сярод нас”, прысвечаная знаёмству з творчасцю таленавітых студэнтаў інтэрната, прайшла 13 снежня ў інтэрнаце № 1. Ні для кога не сакрэт, што паэзія – дзіўны і казачны свет, які заварожвае, абуджае, закалыхвае. Паэзія – гэта крыніца эстэтычнай асалоды.***

У гэты вечар у інтэрнатаўскім пакоі адпачынку эстэтычную асалоду атрымалі ўсе прысутныя. Арганізатарамі мерапрыемства сталі студэнты інтэрната. Паліна Міхаськова, студэнтка 3 курса,



Ганна Качурына, студэнтка 1 курса, якія з'яўляюцца членамі літаратурнага аб'яднання “Натхненне”, падзяліліся сваімі аўтарскімі вершамі, расказалі гісторыю іх напісання.

Сярод прысутных знайшліся і тыя, хто хоць і не піша вершы, але ж неверагодна іх дэкламуе. Асабліва ўразіў сваім прачытаннем першакурснік Ілья Хурсан. Ён прачытаў верш Уладзіміра Высоцкага менавіта так, як у запісе расказваў яго сам Высоцкі! Як расказвае Ілья, яго бацька вельмі часта чытаў вершы і такім чынам прывіў гэту любоў да паэзіі сыну. Вельмі шмат цікавых гісторый гучала тады ў пакоі адпачынку, і ўсе яны па-свойму арыгінальныя. Астатнія вылучаліся чытаннем сваіх самых любімых вершаў.

У час вечарыны студэнты раскрылі сябе зусім з іншага, нечаканага, боку. Як атрымалася, амаль у кожнага ў душы жыве паэт ці празаік.Таму такія мерапрыемствы варта праводзіць часцей для раскрыцця творчага патэнцыялу студэнтаў.

**Паліна ПЧАЛОВА,**
**студэнтка 2 курса гісторыка-філалагічнага факультэта.**

# З ДНЁМ СТУДЭНТА

***“Ад сесіі да сесіі жывуць студэнты весела”. Хто з нас не ведае гэтага выказвання? Думаю, што яно вядома ўсім. Сапраўды, большасць людзей лічаць, што студэнцкія гады – самая бесклапотная пара ў жыцці чалавека. Гэта час новых надзей і чаканняў, прыемных уражанняў і актыўных дзеянняў, яркіх эмоцый і магчымасці рэалізаваць сябе ў новай сацыяльнай ролі.***

17 лістапада штогод у свеце адзначаецца Міжнародны дзень студэнта. З самай раніцы савет студэнцкага самакіравання гісторыка-філалагічнага факультэта павіншаваў усіх студэнтаў з гэтым святам паштоўкамі з прыемнымі пажаданнямі. Актыў факультэцкага аб'яднання ГА «БРСМ» правёў віншавальную акцыю «Студэнтаў былых не бывае!»

Гады ідуць, часы мяняюцца. Мяняюцца і студэнты з гадамі.

Сучасныя студэнты валодаюць сваімі імкненнямі і каштоўнасцямі. Кожны з іх, будучы асобай, мае свой непаўторны характар: адзін упарты і дамагаецца пастаўленай мэты любымі спосабамі, другі непапраўны аптыміст, заражае сваім пазітывам навакольных, трэці цікавіцца выключна дасягненнямі навукі ў пэўнай вобласці. Разнастайнасць характараў не дазваляе адназначна скласці адзіны партрэт сучаснага студэнта.

Сучасны студэнт успрымаецца дынамічным і таленавітым. Ён вылучаецца высокай актыўнасцю і жыццёвай энергіяй, імкненнем да паспяховай кар'еры. Значныя матывамі паводзін сучаснага студэнта з'яўляюцца імкненне да дасягнення асобаснага поспеху, выбар уласных каштоўнасцяў і незалежнасць.

Можа ўсё ж такі жыццё сучаснага студэнта не такое ўжо бесклапотнае, як мы прывыклі лічыць?

І таму мы папрасілі расказаць цяперашніх студэнтаў пра сваё студэнцкае жыццё, пра тое, як праходзіць сесія, і пра самую складаную дысцыпліну. А некаторыя маладыя людзі не пабаяліся падзяліцца пацешнымі выпадкамі, якія здарыліся з імі падчас навучання.

***Рыжанкоў Дзмітрый, студэнт 4 курса гісторыка-філалагічнага факультэта:***

Студэнцкае жыццё – гэта самы яркі і цікавы перыяд у жыцці, калі ты знаёмішся з бясконцай колькасцю



людзей, вучышся нечаму новаму і, вядома ж, здабываеш сяброў. Практычна ў кожную сесію ёсць «аўтаматы» за экзамены, таму вучыцца даводзіцца не так ужо і многа. Самы складаны экзамен – гэта гісторыя на 1 курсе, страшэнна баяўся не здаць, але ў выніку атрымаў добрую адзнаку.

***Максім Лаўроў, студэнт 3 курса факультэта матэматыкі і праграмавання:***

Самым складаным прадметам для мяне была фізіка. Як гэта звычайна бывае, я прыйшоў у інтэрнат і зразумеў, што рыхтавацца зусім лянота. Так прасядзеў да 12 гадзін. Але зразумеў, што ад гэтага ўсё ж залежыць мая стыпендыя, пачаў зубрыць. Да чатырох раніцы. Потым сон пачаў браць сваё. Прачытаў падручнік двойчы за ноч. Зразумеў, што пара на пары толькі калі празвінеў будзільнік. Сабраў мяшкі пад вачыма і адправіўся на пары. Памятаю, што заснуў на экзамене па геаграфіі, але ўсё ж здаў яго на 9. Потым прыйшла чарга фізікі. Убіла ў ступар другое пытанне: яго я і не паўтараў, адказ проста прыдумаў, але, аказалася, адгадаў. У выніку адказаў па ўсіх тэмах. Не памятаю, як дайшоў да інтэрната і лёг спаць. Толькі калі прачнуўся, даведаўся, што здалі толькі трое з 25, а са стыпендыяй застаўся толькі я.

***Качурына Аня, студэнтка 1 курса гісторыка-філалагічнага факультэта:***

Студэнцкае жыццё для мяне – гэта бяссонныя ночы і верныя сябры. Сесія гэтай зімой у мяне першая. Самым складаным і цікавым іспытам будзе філасофія – там вельмі шмат матэрыялу, але гэта вельмі цікава. Калі мяне пытаюцца пра пацешны выпадак, я адразу ўспамінаю, як заснула на філасофіі. Гэта быў перапынак, і я проста заснула, і яшчэ не на сваім месцы. Калі прыйшла выкладчыца, яна проста не стала мяне будзіць. Праз некаторы час я прачнулася і вырашыла пайсці на сваё месца, у мяне занямелі ногі, і я, як качка, ішла праз увесь кабінет. Выкладчыца проста спытала, ці выспалася я. Гэта было вельмі няёмка. Ну а асабіста для мяне студэнцкія гады – самыя лепшыя! Што можа быць лепшае, чым студэнцкае жыццё? Бо менавіта з паступлення ў МДУ ім. А. А. Куляшова пачаўся самы выдатны час у маім жыцці! З першага курса я пачала займацца валанцёрствам, пісаць вершы, стала членам літаратурнага аб'яднання «Натхненне», якім, дарэчы, кіруе мой любімы выкладчык Наталля Аляксандраўна Міхальчук. Гэтак жа я стала прымаць удзел у розных мерапрыемствах універсітэта і Саюза студэнтаў.

Са святам, дарагія студэнты! Хай ваша студэнцкае жыццё прыносіць вам толькі радасць і задавальненне!

**Паліна МІХАСЬКОВА,**
**студэнтка 2 курса гісторыка-філалагічнага факультэта.**

# ТВОРЧАЯ СУСТРЭЧА З ІВАНАМ ПАЎЛАВЫМ

***У межах грамадзянска-патрыятычнага кінапраекта “Час патрыётаў: аб мінулым – дзеля будучыні”, які працягнецца да канца гэтага года, у магілёўскім кінатэатры “Радзіма” прайшла творчая сустрэча з рэжысёрам-пастаноўшчыкам фільма “Падрыў” Іванам Паўлавым.***


Рэжысёр Іван Паўлаў

Іван Паўлаў – вядомы рэжысёр, сцэнарыст. Скончыў Беларускую акадэмію мастацтваў па спецыяльнасці “Рэжысёр ігравога кіно”. З 1993 года працуе на кінастудыі “Беларусьфільм”.

Фільмаграфія Івана Паўлава налічвае вялікую колькасць такіх вядомых работ, як фільм-драма “Глыбокая плынь” (па матывах твораў Івана Шамякіна, 2005 г.), меладрама “Спакуса” (2006 г.), лірычная камедыя “На спіне ў чорнага ката”, серыял “Вяртанне Мухтара-2” (2014–2015 гг.), серыял “Ой, ма-мач-кі!..” (2013, 2017) і многія іншыя.

На прагляд фільма “Падрыў” былі запрошаны студэнты Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. А. Куляшова, навучэнцы сацыяльна-гуманітарнага каледжа ўстановы адукацыі “Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. А. Куляшова”, Магілёўскага дзяржаўнага каледжа мастацтваў і СШ № 18.

На пачатку сустрэчы Іван Паўлаў адзначыў: “Нашы людзі не ўмелі ставіць міны або бомбы, яны іх толькі размініравалі. Маладыя людзі 16–18 гадоў аддалі сваё жыццё, каб ачысціць гарады і палі ад мін і снарадаў”.

Па словах Івана Паўлава, ёсць некалькі прычын паглядзець “Падрыў”: “Першая – гістарычная. Мы паказалі, якімі былі тады хлопцы і дзяўчаты. Другая – важнае пытанне, якое ставіць фільм, – самаахвяраванне. Ахвяраваць сваім часам, жаданнямі, капрызамі дзеля сваіх каханых. Трэцяя – мы паказалі сапраўднае каханне, якое ва ўсе часы была стымулам для добрых здзяйсненняў”.

Такія праекты – важнае звяно ў працэсе захавання гістарычнай памяці ад пакалення да пакалення, і толькі памяць здольная засцерагчы нас ад паўтарэння жудасных урокаў гісторыі. І пакуль мы не здрадзім памяці, збожжа фашызму ніколі не прарасце. Часта для засваення інфармацыі сённяшній моладзі патрэбна візуалізацыя.

Фільм “Падрыў” – вынік плённага супрацоўніцтва кінастудыі “Беларусьфільм” і Супрацьміннага цэнтра Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь.

1945 г. Яшчэ не скончылася Другая сусветная вайна, а на тэрыторыі вызваленай Беларусі разгортваюцца работы па маштабнай ачыстцы тэрыторый ад спадчыны вайны – разрыўных ям, мін і снарадаў, якія засталіся ў зямлі на месцы баявых дзеянняў. Для таго каб ачысціць тэрыторыі, з ліку падлеткаў-добраахвотнікаў ствараюцца атрады. Менавіта тут сустракаюцца нашы героі – дзяўчаты і хлопцы, якія мараць унесці свой уклад у вяртанне сваёй Радзімы да мірнага жыцця.

Пасля таго як уключылі святло, яшчэ некалькі хвілін у зале стаяла поўная цішыня...

Сустрэча адбылася сапраўды вельмі насычанай і змястоўнай. Цікава было пазнаёміцца з такім знакамітым і таленавітым беларускім акцёрам і рэжысёрам.

**Паліна МІХАСЬКОВА,**
**Дар'я ПАРАЛЁВА,**
**студэнты гісторыка-філалагічнага факультэта.**

# ЛИДЕР МЕТОДИЧЕСКОЙ НАУКИ

ЛИЧНОСТЬ

***В декабре нынешнего года ветеран кафедры литературы и межкультурных коммуникаций МГУ имени А.А. Кулешова Луиза Сергеевна Шакирова отметила свое 85-летие. Безусловно, это особенная дата, которая скрывает за собой и много трудностей, связанных, прежде всего, со здоровьем, и много радостных минут, воспоминаний о большой профессиональной судьбе, ярких научных достижениях и сотнях студентах, подготовленных к профессиональной деятельности и сегодня активно работающих в школах и вузах.***



Л. С. Шакирова

Родилась Луиза Сергеевна очень далеко от Могилева – в городе Хабаровске, на другом конце Евразийского континента. Поскольку ее отец был военным, семья «кочевала» по Дальнему Востоку. Будущему филологу пришлось в нелегких условиях постигать азы науки, менять многие места учебы. В 1955–1959 годах Луиза Сергеевна училась на историко-филологическом факультете Хабаровского педагогического института, по окончании которого по распределению была направлена на работу в п. Озерное Камчатской области, где в средней школе преподавала русский язык и литературу, а также историю.

В 1962 году молодая учительница стала аспиранткой Ленинградского государственного педагогического института им. А.И. Герцена на кафедре методики преподавания литературы. Научную работу над темой «Изучение восприятия художественной литературы школьниками как одна из основ анализа художественного произведения в школе» Луиза Сергеевна вела под руководством прославленного методиста-словесника Зинаиды Яковлевны Рез. Успешная защита диссертации состоялась в 1968 году.

После окончания аспирантуры Луиза Сергеевна была направлена на работу в Комсомольск-на-Амуре. В 1969–1970 годах исполняла обязанности заведующего кафедрой русской и зарубежной литературы педагогического института в этом дальневосточном городе.

С 1974 года Луиза Сергеевна трудится в Могилевском пединституте–университете. Основным ее курсом являлась методика преподавания русской литературы. Студентам врезались в память необыкновенно эмоциональные лекции Луизы Сергеевны, на которых она блестяще раскрывала перед еще неопытными будущими филологами тайны художественных миров русских поэтов и писателей.

Связь со школой, с живым преподаванием словесности для Луизы Сергеевны всегда необыкновенно важна. Благодаря ее неутомимой энергии были установлены тесные контакты кафедры с лучшими учителями города и области. Студенты-филологи получили возможность знакомиться с лидерами преподавательского искусства. А толстые тетради методических разработок, сделанные под руководством Луизы Сергеевны, безусловно, сегодня в разных, больших и маленьких школах страны используются учителями-практиками в их работе.



Л. С. Шакирова в кругу ветеранов труда ФСФ. 2012 г.

Не менее ценен для учеников Луизы Сергеевны и опыт внеаудиторной работы, полученный от нее. Многие годы она вела методический кружок, организовывала литературные вечера. Эти встречи, проходившие в тихих залах художественного музея имени В.К. Бялыницкого-Бирули, для многих выпускников филологического факультета являются самыми яркими воспоминаниями студенческой поры, когда они писали сценарии, выучивали наизусть большие и маленькие стихотворения, репетировали выразительное чтение и, наконец, вдохновенно читали стихи для своих друзей.

Выход на заслуженный отдых для Луизы Сергеевны остался лишь фактом бюрократической литературы. В реальной жизни она активно продолжала научную работу в избранном методическом направлении. Луиза Сергеевна еще долгие годы оставалась завсегдатаем абонемента и читального зала университетской библиотеки. Она по мере сил восполняла огромный пробел в современной методической науке, ставшей академически заумной, но нередко «бездетной», поскольку ученые стремятся донести до учащихся свои концепции, не задумываясь о том, а какие именно ассоциации, образы и мысли возникают в головах новых поколений, читающих, казалось бы, всем известные классические, хрестоматийные тексты. На заседаниях кафедры литературы не раз обсуждались учебные пособия Луизы Сергеевны для учителей, написанные уже на пенсии, был опубликован сборник сочинений наиболее одаренных студентов.

Коллеги и многочисленные ученики с благодарным и светлым чувством в душе поздравляют Луизу Сергеевну с юбилеем и желают ей благополучия и здоровья, как говорится, «крепости тела и крепости духа»!

**Доцент кафедры литературы и межкультурных коммуникаций С.Э. СОМОВ.**

# МАЯ ЛЮБІМАЯ КНІГА

***У кожнага чалавека на зямлі ёсць любімая кніга, яна можа заставацца нязменнай на працягу цэлага жыцця, і, перачытваючы яе зноў і зноў, чалавек чэрпае кожны раз новыя веды. А ёсць людзі, інтарэсы якіх мяняюцца, а значыць, і любімых кніг можа быць некалькі.***



Н. А. Міхальчук

У наш век інфармацыйных тэхналогій, усеагульнай камп'ютарызацыі многія адмаўляюцца ад літаратуры, гавораць, што чытаць кнігі ўжо не актуальна. Асмелюся сцвярджаць, што такія людзі памыляюцца. Кніга ніколі не страціць сваю значнасць, заўсёды будзе нашым настаўнікам, памочнікам, сябрам, праваднікам у іншыя светы і эпохі.

Кнігі ўмеюць цярпліва чакаць свайго часу. Некаторыя з іх на адно прачытанне, забываюцца вельмі хутка, яшчэ пры жыцці іх аўтараў. Сапраўдны ж твор – заўсёды з чытачамі, і нават забароненая, схаваная, яна заўсёды вяртаецца і дапамагае людзям жыць. Кнігі, як, зрэшты, і любая іншая справа, якой вы захапляецеся, – гэта і ёсць той плод, які дапаможа сысці з манатонных будняў, ад пошласці, шэрасці і нуды ў свет прыгажосці і натхнення.

Пасяджэнне літаратурнага аб'яднання «Натхненне» прайшло 30 лістапада ў новым фармаце. У гэты раз яно адбылося ў фармаце кніжнага клуба: удзельнікі аб'яднання падзяліліся адзін з адным сваімі любімымі творамі мастацкай літаратуры.

У пачатку пасяджэння Наталля Аляксандраўна Міхальчук, кіраўнік аб'яднання, адзначыла: «Няма ніводнага паэта або пісьменніка, які не любіў бы чытаць. Для пішучага чалавека ці нават проста для філолага, сапраўднага філолага, кнігі значаць многае ў жыцці. Гэта тая крыніца, які сілкуе творчасць, дае выратаванне ў цяжкую хвіліну. Гэта праца душы».

Многае патрабуецца ад чытача, каб умець зразумець добрую кнігу. Таму так важна, каб працэс зносін пісьменніка, паэта з чытачом заўсёды быў жывым, рабіў наша духоўнае жыццё больш багатым, яркім і радасным.

Падчас пасяджэння студэнты расказалі пра свае любімыя творы, такія, як «Над прорвай у жыце» Дж. Сэлінджэра, «Кветкі для Элджэрнона» Д. Кіза, «Калекцыянер» Дж. Фаўлза, «Абарона Лужына» У. Набокава, «Шпулька сініх нітак» Э. Тайлер і іншых.

Ганаровымі гасцямі мерапрыемства сталі супрацоўнікі Магілёўскай абласной бібліятэкі імя У. І. Леніна – загадчык аддзела абанемента Марына Аляксандраўна Скубілава і бібліятэкар першай катэгорыі Ала Мікалаеўна Маркевіч. Яны арганізавалі выставу навінак мастацкай літаратуры, расказалі аб кнігах, якія паступілі ў абласную бібліятэку ў апошні час.



Былі запланаваны сумесныя праекты паміж «Натхненнем» і Магілёўскай абласной бібліятэкай імя У. І. Леніна, такія, як сумесны ўдзел у дні адчыненых дзвярэй у бібліятэцы, творчыя сустрэчы і новыя пасяджэнні кніжнага клуба.

**Наш кар.**

# Я – ВАЛАНЦЁР!

***У наш час слова «валанцёр» ва ўсіх на слыху, і цікавасць да валанцёрства пастаянна расце. Безумоўна, удзел у розных мерапрыемствах і знаёмства з вялікай колькасцю новых людзей выклікае вялікую цікавасць. Але я ўсё больш пераконваюся ў тым, што валанцёр – гэта лад жыцця.***



5 снежня на нашым факультэце ў гонар Міжнароднага дня добраахвотніка валанцёры правялі сярод студэнтаў віктарыну «Я – валанцёр». Усе жадаючыя прынялі актыўны ўдзел, па выніках віктарыны ўдзельнікі атрымалі салодкі прыз.

Хто такі валанцёр? Для мяне гэта такі чалавек, які добраахвотна і без аплаты займаецца арганізаванай грамадска карыснай дзейнасцю. Той, хто прыносіць радасць усім людзям, аказваючы ім якую-небудзь дапамогу і не просячы нічога ў замен. Той, хто змяняе жыццё людзей, у тым ліку і сваё, у лепшы бок. Той, хто з кожным днём удасканальваецца і папаўняе сваю скарбонку добрых спраў.

На мой погляд, быць валанцёрам вельмі адказна, важна, цікава, займальна і актуальна, бо валанцёр мае шмат магчымасцяў. Па-першае, ты павышаеш сваю самаацэнку: ты заўсёды ўсведамляеш, што дорыш дабро і таму ты сам становішся лепшым. Ты пачынаеш адчуваць сябе па-іншаму. І стаўленне да цябе з боку навакольных таксама мяняецца. Па-другое, ты можаш наведаць розныя цікавыя месцы, напрыклад, з'ездзіць за мяжу, і праз гэта спазнаеш свет, удасканальваеш замежную мову. Па-трэцяе, ты будуеш падмурак сваёй будучай кар'еры: калі ты ўладкоўваешся на працу, запытваюць тваё рэзюмэ і просяць расказаць, чым ты займаешся ў жыцці. А валанцёрства тут – вялікі плюс для цябе. Па-чацвёртае, знаходзіш новых сяброў, заводзіш цікавыя знаёмствы на ўсё жыццё. Гэта могуць быць людзі з іншых гарадоў, краін, з іншых кантынентаў. Гэта магчымасць пазнаёміцца з людзьмі з іншага акружэння, магчымасць паглядзець на свет іншымі вачыма. Па-пятае, раскрываеш свае таленты. Чым бы ты ні захапляўся, ні займаўся, у валанцёрскім руху для ўсяго знойдзецца месца, і ты зможаш рэалізаваць свае здольнасці. Нарэшце, ты проста адчуваеш сябе чалавекам, што вельмі важна.

Вось чаму я стала валанцёрам. Валанцёрскай дзейнасцю я займаюся з 2014 года. І я ні разу не пашкадавала аб гэтым, таму што гэта сапраўды так цікава! І я люблю дарыць радасць людзям, таму што, бачачы іх шчаслівыя твары, я разумею, што ў гэтым ёсць і мая заслуга, што я раблю важную і патрэбную справу, што мая праца дае свой вынік.

Са свайго невялікага вопыту я зразумела, што валанцёрства – гэта яркае і добрае жыццё. Гэта калі ты ідзеш дадому пасля якой-небудзь акцыі і ўсміхаешся таму, што ты сёння падарыла кавалачак шчасця і дабра іншым людзям. І ўзнікае такое пачуццё, што гэта не я прыйшла дапамагчы людзям, а яны мне. Мы самі творцы свайго лёсу, і нішто не можа нам перашкодзіць смела рухацца да дасягнення пастаўленых мэтаў.



Быць валанцёрам для мяне – гэта рабіць людзям дабро, дарыць ім радасць і праз гэта адчуваць сябе патрэбнай грамадству.

Паважаныя валанцёры, віншуем вас з гэтым цудоўным святам. Жадаем, каб дабро, якое вы прыносіце людзям, абавязкова вам вярталася.

Таксама ў гэты дзень хочацца сказаць вам словы падзякі за ваш энтузіязм, ваша цярпенне, неабыякавасць і бескарыслівасць.

**Паліна МІХАСЬКОВА, студэнтка 2 курса гісторыка-філалагічнага факультэта.**

# КАК СПРАВИТЬСЯ СО СТРЕССОМ

***Продолжение, начало в № 8 (297).***

***О том, как вовремя заметить сложное психологическое самочувствие и как с ним справиться, рассказывает педагог-психолог социально-педагогической и психологической службы университета И.Л. Милочкина.***

**– Каждый ли может справиться со стрессом самостоятельно?**

– В большинстве случаев здоровый человек может справиться со стрессом самостоятельно. Необходимо понять, что происходит в тот или иной момент стресса с тобой и, исходя из этого, действовать. Например, вы буквально «кипите», готовы «взорваться». часто мы слышим, что нельзя держать гнев в себе, так как это негативно может отразиться на здоровье и в то же время нецелесообразно обрушивать его на свое окружение, что может привести к конфликтам, непониманию, разрывам отношений. Что же делать? Нужно использовать оптимальный вариант «разрядки» – выйти из помещения и пройти 2-3 квартала быстрым шагом или пробежать, подняться по лестнице, пропылесосить квартиру, отжаться или поприседать. Это ничего не изменит в ситуации, однако поменяет биохимию организма и вы оцените ее спокойнее, всесторонне и, может быть, найдете выход из создавшегося положения.

В таких ситуациях, когда истощились энергетические и физические ресурсы, отрицательную эмоцию нельзя разрядить мышечными усилиями и интенсивная физическая нагрузка может быть вредной. Человеку на этом этапе стресса хочется застыть, чтобы его оставили в покое. В такой момент как никогда требуется поддержка, дружеское участие, важно уметь обратиться к другим за поддержкой. Нужно взять тайм аут, время для отдыха, переключиться на другие дела, уйти от ситуации, вызвавшей сильное напряжение. Полезна смена впечатлений, поездки. Целесообразно на время вообще отказаться от решения проблемы, обусловившей сильное напряжение, чтобы дать передышку нервной системе.

**– Когда нужно обращаться за профессиональной помощью?**

– Если актуальность стоящей задачи не уменьшается и она требует решения, то состояние напряжения может возрасти еще больше, достигая степени, представляющей собой уже болезнь – невроз. Обращаться к врачу необходимо, когда возникают стойкие изменения сна, бессонница, частые просыпания ночью, невозможность заснуть, проблемы со здоровьем.

**– Какие методы профилактики стресса вы бы рекомендовали?**



*Развитие позитивного мышления и чувства юмора*

Первым шагом к успеху в любом начинании является психологическая установка на успех, абсолютная уверенность в том, что цель будет достигнута. Необходимо приучить себя к успеху, удаче, сделать ее само собой разумеющейся, привычной. Исследования по профессиональному отбору в ОВД, проводимые в Российской Федерации в 2020 году, показали, что сотрудники, обладающие чувством юмора, легче адаптируются к условиям несения службы и лучше справляются со стрессовыми ситуациями.

*Настройка правильного восприятия*

Экспериментально доказано, что нежелательные психические и физические реакции напрямую зависят от негативных мыслей. Испытуемым сделали инъекцию адреналина – сильнейшего гормона стресса. Последовала нормальная для этой ситуации физическая реакция (учащение сердцебиения и пр.).

ЭТО ИНТЕРЕСНО

Но так как причин для беспокойства не было, никаких психологических реакций (страха, дурных предчувствий) не наблюдалось.

К сожалению, мы идем на поводу у отрицательных эмоций, не осознавая их истинной причины

*Локус контроля*

Люди, полагающие, что они контролируют свои действия, испытывают гораздо меньше отрицательных эмоций, чем те, которые думают, что от них ничего не зависит. Позиция, которую при этом занимает человек, называется «локус контроля».

Итак, чем чаще вы будете напоминать себе, что именно вы управляете своей жизнью, тем реже будете ощущать себя листочком, трепещущим на ветру. Мысль о том, что вы брошены на произвол судьбы, усиливает стресс. Между тем уверенность в том, что вы можете справиться с любой неприятностью, уменьшает его.

Чтобы научиться контролировать стресс, проанализируйте свой образ жизни, приобретенный опыт и разработайте собственную стратегию противостояния стрессу.

*Поддержание хорошей спортивной формы*

Простые физические упражнения – прекрасный способ немедленно ослабить напряжение.

Умеренная физическая нагрузка заряжает энергией, помогая организму освободиться от гормонов стресса. Выберите наиболее подходящий для вас вариант – это сократит вероятность того, что вы быстро сдадитесь.

По двадцать минут в день прогуливайтесь пешком. Помимо того что ходьба полезна для здоровья, вы сможете полюбоваться окружающей природой, что не удастся сделать из окна машины, автобуса или поезда.

Достаньте ваш старый велосипед или купите новый – и наслаждайтесь путешествием.

Запишитесь в спортивный клуб на плавание или в группу здоровья.

**Беседовала Юлия ПАПСУЕВА.**
**Фото сайта: https://www.rexona.com.**

Універсітэцкі веснік

ЗАСНАВАЛЬНІК
Установа адукацыі «Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.А.Куляшова»

Рэдактар С.Э. СОМАЎ

Карэктура: І.Г. Каржова, Г.В. Карпянкова

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў.
Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі.

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
212000, г. Магілёў,
вул. Касманаўтаў, 1.
70-43-51

Падпісана да друку а 17 гадзіне 31.12.2022 г. Тыраж 100 экз. Газета набрана і надрукавана ў абласной друкарні (г. Магілёў, вул. Першамайская, 70). Зак.4533.